# Прыём "Энцыклапедыя аднаго слова"

**У кабінеце беларускай мовы і літаратуры Ёдкаўскай сярэдняй школы Лідскага раёна кожны дзень кіпіць руплівая праца. Акрамя вучэбных і факультатыўных заняткаў, гурткоў, зацікаўленыя школьнікі вучацца пісаць свае першыя навукова-даследчыя работы.**

Упэўнена, у кожнага настаўніка-філолага ёсць свае сакрэты, якія ён перадае вучням, каб забяспечыць паспяховы ўдзел у розных даследчых канферэнцыях. Ёсць такія сакрэты і ў мяне. У першую чаргу, вучу школьнікаў (вучняў 5—6-х класаў) карыстацца рознымі слоўнікамі і даведнікамі. Важна даць станоўчы прыклад прымянення гэтай навукова-даведачнай літаратуры: паведаміць, што слоўнік як сродак інтэлектуальнага развіцця высока цаніў Іван Шамякін. Ён вучыўся пастаянна, адкрываў таямніцы пісьменніцкага майстэрства, імкнуўся авалодаць навукай слова. Хоць пісаў па-беларуску, але любіў карыстацца слоўнікам Уладзіміра Даля: чытаў яго як мастацкі твор. Юны даследчык павінен зразумець, што толькі ў слоўніку або даведніку ён можа знайсці дакладную інфармацыю, што праца са слоўнікам навучыць яго самастойна здабываць веды, гаварыць і пісаць без памылак.

У якасці першага даследавання прапаную вучням прыём "Энцыклапедыя аднаго слова", які ўключае ў сябе развіццё наступных універсальных вучэбна-пазнавальных кампетэнцый: самастойны пошук неабходнай інфармацыі, аналіз, сінтэз, класіфікацыя, супастаўленне, параўнанне, вылучэнне гіпотэз, доказ. Удзячным у гэтым плане з'яўляецца слова "дарога", якое даследуецца ў наступнай паслядоўнасці: слова "дарога" і яго лексічнае(-ыя) значэнне(-і); слова "дарога" і словы-сваякі; слова "дарога" і яго сінонімы; слова "дарога" і яго антонімы; слова "дарога" ў фразеалагічных зваротах; слова "дарога" ў беларускім фальклоры (у казках, загадках, прыкметах, павер'ях, прыказках, прымаўках); слова "дарога" ў назвах твораў беларускай літаратуры; слова "дарога" ў даведніках; слова "дарога" ў тэкстах беларускай літаратуры; слова "дарога" ў ілюстрацыях. Частку задання вучням неабходна выканаць у школе з дапамогай слоўнікаў, а некаторую інфармацыю неабходна адшукаць самастойна ў даведніках або ў іншай літаратуры.

У гэтым навучальным годзе "Энцыклапедыю слова "дарога" складалі вучні 6 класа. Яны выявілі, што слова "дарога" мае пяць значэнняў, у фразеалагічных зваротах ужываецца больш за 30 разоў, да слова "дарога" можна падабраць каля ста сінонімаў, а героі беларускіх народных казак вельмі часта ідуць па дарозе. "Зімовая дарога" Максіма Багдановіча, "Доўгая дарога дадому" Васіля Быкава, "Дарога" Якуба Коласа, "Сцежкі-дарожкі" Міхася Зарэцкага — гэта далёка не поўны пералік твораў беларускіх пісьменнікаў са словам "дарога".

У канцы работы было праведзена анкетаванне, каб высветліць, ці спадабалася вучням даследаваць моўныя з'явы, здзяйсняць пошук неабходнай інфармацыі, рабіць вывады.

Знайшліся вучні, якія вельмі зацікавіліся складаннем "Энцыклапедыі слова "дарога". Было прапанавана даследаваць гэтае слова ў рускай і англійскай мовах, а затым зрабіць вывад аб тым, які народ больш разнастайна прымяняе слова "дарога" ў сваёй мове. З вынікамі даследавання вучні плануюць выступіць на школьнай навукова-даследчай канферэнцыі.

**Таццяна МАРЦЭВІЧ,**
**настаўніца беларускай мовы і літаратуры Ёдкаўскай сярэдняй школы Лідскага раёна.**